# Прыроднае згуртаванне поле



17. А Адаму сказаў: за тое, што ты паслухаўся голасу жонкі тваёй і еў з дрэва, пра якое Я наказаў табе, сказаўшы: «ня еж зь яго», праклятая зямля за цябе; са скрухаю будзеш карміцца зь яе ва ўсе дні жыцьця твайго;
18. церне і ваўчкі ўзгадуе яна табе; і будзеш карміцца польнаю травою;
19. У поце твару твайго будзеш есьці хлеб, пакуль ня вернешся ў зямлю, зь якое ты ўзяты; бо пыл ты і ў пыл вернешся.
(Быцьцё 3:17-19)

**Поле** – штучнае прыроднае згуртаванне, створанае чалавекам пад вырошчванне сельскагаспадарчых культур.

| Поле | | | | |
|---|---|---|---|---|
| Збожжавыя культуры | Агароднінныя культуры | Бабовыя культуры | Алейныя культуры | Валакністыя культуры |
|  |  |  |  |  |
| Пшаніца, жыта, ячмень, авёс, грэчка, рыс кукуруза і г.д | Бульба, капуста, цыбуля, буракі, морква і г.д. | Гарох, фасоля, соя, боб, сачавіца, нут і г.д. | Рапс, сланечнік, аліва, кунжут, алейная пальма, і г.д. | Лён, каноплі, бавоўна і.г.д. |

# Злакі, збожжавая культура – травяністая расліна, з полым сцяблом, якое скончваецца коласам, у якім выспявае зерне



З пшаніцы робяць белы хлеб, манную крупу





З жыта пякуць чорны хлеб. Гэта самая распаўсюджанае збожжа Беларусі





З ячменю робяць ячневую і пярловую крупу





З аўсу робяць аўсяныя шматкі - геркулес



# Злакі, якія не растуць у Беларусі



З проса робяць пшонную крупу






Рыс - асноўны злак азіяцкіх краін





Грэчка





Кукуруза - асноўны злак Афрыкі і Амерыкі, у Беларусі вырошчваюцца толькі кармавыя сорты



# Расліны поля могуць быць культурнымі і пустазеллем. З пустазеллем чалавек пастаянна змагаецца




1 — куколь; 2 — маці-і-мачаха;
3 — зарніца;
4 — павой палявы (бярозка);
5 — дзьмухавец; 6 — асот жоўты;
7 — свірэпіца; 8 — рагулька

Пустазелле расце хутчэй за культурныя расліны, паглынае шмат вады і пажыўных рычываў з глебы і дае шмат насення.
Цяпер ёсць хімічныя сродкі барацьбы з пустазеллямі. Але карыстацца імі трэба асцярожна. Бо разам з пустазеллямі можна атруціць зямлю і ўсё жывое вакол.

# Жывёлы поля

## Сябры поля










жаўрук шэрая курапатка





грак

сава

## Ворагі поля









Сярод жывёл сустракаюцца двудушныя асобы. Птушкі ратуюць расліны ад шкоднікаў, але і ядуць збожжа. Матылькі апыляюць кветкі, але іх вусені ядуць расліны. Ну а суслікі, хамякі і мышы – гэта адмоўныя героі. Яны ядуць насенне, псуюць карані і сцеблы раслін.

# Чым адрозневаецца поле ад іншых прыродных згуртаванняў

- Кругазварот рэчываў замыкаецца пры дапамозе чалавека, бо чалавек забірае ўраджай
- Расце невялікая колькрсць раслін
- Кароткія ланцужкі харчавання, з-за невялікай колькасці жывёл
- На полі расце адзін від культурнай расліны

# Як залежыць поле ад чалавека

- Чалавек уносіць угнаенні на поле, по няма натуральных разбуральнікаў і перагною
- Чалавек арэ поле, насычаючы зямлю кіслародам, бо ў зямлі мала чарвей і натуральных «аратых»
- Чалавек поліць поле ад пустазелля і змагаецца са шкоднікамі.

